Алесь Карлюкевіч



# КРЫНІЦА ПАНОЎ ЕЛЬСКІХ



**Алесь Карлюкевіч**

Алесь Карлюкевіч

# КРЫНІЦА ПАНОЎ ЕЛЬСКІХ

*Казка*



Мінск
«Мастацкая літаратура»
2014

УДК 821.161.1-93
ББК 84(Беи)-44
К23

Ілюстрацыі *Віталя Дударэнкі*

ISBN 978-985-02-1511-6

© Карлюкевіч А. М., 2014
© Афармленне. УП «Мастацкая літаратура», 2014

# *Дарагі сябра!*

*Максімка, з якім ты пазнаёмішся ў гэтай кнізе, збірае паштовыя маркі. Такі занятак называецца «філатэліяй». Захапленне паштовымі мініяцюрамі перадалося хлопчыку ад бацькі. Разам яны складваюць маркі ў альбомы і кляссеры, вядуць ліставанне з філатэлістамі з усяго свету. Паштовыя маркі дапамагаюць знаёміцца з новымі краінамі, рабіць сапраўдныя геаграфічныя і нават гістарычныя адкрыцці. А яшчэ дапамагаюць вучыць урокі. На марках змяшчаецца столькі інфармацыі, што часам іншая з паштовых мініяцюр роўная па сваім змесце сапраўднай кнізе. А яшчэ Максімку філатэлія прымусіла быць уніклівым і адказным за свой родны край, за стан прыроды, за чысціню лясоў і рэк. Родная зямля — велізарнае багацце, без якога нам проста не пражыць.*

*З Максімкам адбываюцца самыя розныя прыгоды. Часам у верагоднасць некаторых з іх і паверыць цяжка. Але ж вы паспрабуйце прайсці тым шляхам, які абраў наш юны герой. Дзеля гэтага нават не абавязкова быць філатэлістам, збіраць паштовыя маркі. Проста важна ўдумліва прачытаць кнігу і пастарацца знайсці сваё месца ў жыцці, паспрабаваць свае захапленні і зацікаўленні зрабіць карыснымі, патрэбнымі для сябе, сваіх бацькоў, сваёй Радзімы.*

*Прыемнага чытання, дарагі сябра!*

Алесь Карлюкевіч

# МАКСІМ МІНСКІ ВЯРТАЕЦЦА СА ШКОЛЫ



*Клопаты чацвёртакласніка. Захапленне бацькі і сына Мінскіх. Новы від алімпійскай праграмы. Сенсацыйнае паведамленне «Алімпійскай газеты».*

Максімка, перайшоўшы ў чацвёрты клас, атрымаў ад таты новае даручэнне. Дагэтуль хлопчык меў толькі два асноўныя заданні. Дарогаю са школы трэба было завітаць у хлебную краму і набыць палову хлебнага каравая. Звычайна з раніцы бацькі наказвалі, каб хлопец купіў «Нарачанскі». Здаралася, што замова паступала ад таты. Тады даводзілася набыць мякенькі, у поліэтыленавай плёнцы «Радзівілаўскі»...

Летась у дадатак да паходу ў хлебную краму тата даў сыну новае заданне. Паколькі на завод бацька выпраўляўся вельмі рана, калі яшчэ ўсе газетныя шапікі былі зачыненыя, то і папрасіў, каб сын купляў «Алімпійскую газету». Яна выходзіла па панядзелках і пятніцах. Звычайна, пакуль тата прыходзіў з працы, хлопчык паспяваў прачытаць дзве-тры нататкі. Асабліва падабаліся яму рэпартажы са спаборніцтваў на азёрах і рэках Беларусі. З мінулага года ў алімпійскую праграму былі ўлічаныя гонкі на чаўнах. Прапанову выказалі амерыканцы, якія знайшлі вытокі

гэтых спаборніцтваў у старажытнай індзейскай культуры. А ў Беларусі адразу ўзгадалі, што і ў нашай мінуўшчыне човен не апошняе месца займае.

А з сёлетняга верасня Максіму даручылі яшчэ забіраць пошту з металічнай скрыні ў пад'ездзе. На ўсе дзвесце кватэр першага пад'езда пяцідзесяціпавярховага гмаха, у якім жыў разам з бацькамі хлопчык, унізе віселі ўсяго толькі чатыры скрыні. Відаць, астатнія жыхары хмарачоса даўно забыліся на папяровую пошту. Максімкаў тата, праграміст паводле адукацыі, які працаваў у канструктарскім бюро аўтамабільна-трактарнага холдынга, меў адно старамоднае захапленне — збіраў паштовыя маркі. Таму і ліставаўся з калекцыянерамі розных краін свету. Звычайна штодня прыходзілі два-тры папяровыя лісты. На кожным канверце — прыгожая маляўнічая марка. Тата збіраў лісты на стале ў сваім рабочым кабінеце. У суботу з раніцы, узяўшы Максіма, хадзіў на сталічны Галоўпаштамт альбо на сходы філатэлістаў — такіх самых захопленых, як і сам, збіральнікаў паштовых марак. А ўвечары сядаў пісаць лісты.

...У пятніцу Максім адчыніў дзверы пад'езда пазней за звычайнае. Пасля школы давялося абысці некалькі шапікаў. Толькі ў чацвёртым з іх натрапіў на «Алімпійскую газету». Газеты таксама пачалі станавіцца рэдкасцю. Навіны людзі звычайна чэрпалі з электронных інфармацыйных парталаў. А ў асноўным людзі (і моладзь, і нават старэнькія бабулькі) дык і ў транспарце не забываліся праглядаць сеціва, каб не прапусціць якую сусветную навіну... Сораму ж пасля не абярэшся, калі пра нешта даведаешся пазней за іншых. Але ўсё ж былі яшчэ і дзівакі, якія чыталі папяровыя выданні.

...Збіраючыся запхнуць нумар «Алімпійскай газеты» ў ранец, Максім выпадкова зірнуў на апошнюю, 96-ю, старонку. І што ён там прачытаў!.. «Спаборніцтвы гоншчыкаў на чаўнах, якія праходзілі на Пцічы, скончыліся надзвычайным здарэннем. Човен пад нумарам «7», якім кіраваў беларускі спартсмен Собаль, патрапіў у вір і на дыстанцыі ад вёскі Навaполле да вёскі Белькавічы знік з поля зроку тэлевізійных камер, што былі пастаўленыя праз кожныя 100 метраў. Пошукі, на якія выправіліся вольныя ад стартаў спартсмены, нічога не далі. Не знайшлі спартсмена і раніцою». «Вось дык навіна!» — здзівіўся Максім, суперажываючы невядомаму яму Собалю. Хаця, чаму невядомаму? У апошнія месяцы акурат гэты човеншчык не раз упрыгожваў сваёй выявай першую старонку «Алімпійскай газеты». І відаць па ўсім, што якраз ён, Собаль, змог бы скласці канкурэнцыю амерыканскім спартсменам на чарговай Алімпіядзе.

## Падказкі ад дзеда Усяведа

**Філатэлія** — калекцыянаванне і вывучэнне знакаў паштовай аплаты, дакументаў, звязаных з поштай. Узнікла ў Англіі, дзе ўпершыню з'явіліся паштовыя маркі, якія замянілі грашовую аплату за перасылку лістоў. У Беларусі пашырана тэматычнае калекцыянаванне паштовых марак. Упершыню беларускія паштовыя маркі выдадзеныя ў Латвіі ў 1920 годзе.

**Паштовая марка** — спецыяльны знак, які выпускаецца і прадаецца нацыянальнымі паштовымі ведамствамі. Служыць для палёгкі грашовых збораў

за перасылку, якую ажыццяўляе пошта. Звычайна марка ўяўляе сабою аркушык паперы невялікага памеру — з зубчыкамі, з клеем на зваротным баку.

**Човен** — лодка, выдзеўбаная з дрэва. Звычайна — з дубу, хвоі, асіны. Памеры — ад 2,5 да 10 метраў у даўжыню, 1 — 1, 5 метра ў шырыню. Кіруюць чоўнам аднапалосным вяслом. На пачатку 20 стагоддзя быў выцеснены лодкамі.

## УСЯ КРАІНА ШУКАЕ СПАРТСМЕНА СОБАЛЯ



*Паступіла прапанова спыніць раку. Якімі могуць быць наступствы? Ці жывы яшчэ спартсмен Собаль?*

...Акурат у той час, калі нумар «Алімпійскай газеты» ўжо быў падрыхтаваны для здачы ў друкарню, ішло сумеснае пасяджэнне Федэрацыі гоншчыкаў на рачных чаўнах, Алімпійскай управы краіны і Галоўнага Дэпартамента па зберажэнні водных рэсурсаў. На павестку дня ўдзельнікі сходу вынеслі адно пытанне: «Ці варта спыніць плынь ракі Пціч, адвёўшы яе ваду на палі і лугі, каб знайсці вялікага спартсмена і высветліць ісціну?..» А пакуль усе гэтыя пытанні

абмяркоўваліся, у газеце побач з трывожнай нататкай ужо занялі свае месца два невялікія артыкульчыкі. Іх усхваляваны Максімка і прагледзеў у пад'ездзе. Аўтарам аднаго з артыкулаў быў эксперт па рэках Галоўны Водны Кансультант Сцяпан Паўлавіч Нёманскі. І вось пра што ён апавёў чытачам: «Сучасныя механізмы дазваляюць правесці спыненне ракі ў лічаныя гадзіны. Трэба толькі даць каманду зачыніць некалькі шлюзаў, што пабудаваныя вышэй за Навраполле. Вада, што паспее перасекчы гэтую мяжу, пабяжыць далей. А вось з тымі рачнымі запасамі, якія будуць спыненыя і скіраваныя на лугі і палеткі, усё на шмат складаней. І не толькі таму, што зямля на сотні метраў каля ракі пераўтворыцца ў багну. І не толькі таму, што рыба заблытаецца ў траве, а застаўшыся зусім без вады — загіне. Невядома, што яшчэ будзе з бабрамі, ра́камі і іншымі насельнікамі Пцічы. А іх, як вы ведаеце, сёння не так шмат і на планеце. Мы заўсёды ганарыліся, што чысцюткая Пціч дала ім надзейны прытулак. А найгалоўнейшае — знікне вада. І вярнуць яе пасля ў гэтыя панадпцічанскія ваколіцы будзе вельмі і вельмі цяжка...»

Асабліва сумна стала Максімку, калі ён прачытаў пра баброў. У школе неаднойчы казалі пра тое, што за апошнія сто гадоў у Беларусі настолькі ўзнавілі папуляцыю баброў, што іх было не меней чым дзвесце-трыста гадоў таму. А ў некаторых палескіх куточках бабры ажно гаспадарамі сябе пачувалі. Выбудоўвалі цэлыя рачныя гарадкі, ставілі плаціны, запруджвалі прырэчныя лугавіны. У такія мясцінкі любілі наведвацца замежныя кінематаграфісты, бо болей нідзе ў Еўропе яны не маглі зняць фільмы пра бабрыны талент гаспадарання. Баброў у Беларусі на



гэты час мелася амаль 100 тысяч. Было, праўда, і іншае... Лічылася, што амаль дзвесце гадоў таму бабры зусім зніклі з Беларусі. І толькі на пачатку трыццатых гадоў 20 стагоддзя невялікую калонію гэтых цікавых і працавітых звяркоў знайшлі на рацэ Бярэзіна... З гістарычных кніг Максімка ведаў, што ў свеце існуе нямала паселішчаў, жыхары якіх на працягу стагоддзяў уважаюць бабра за свайго галоўнага сябра і ахоўніка. У Бабруйску, на Магілёўшчыне, нават помнік бабру ледзьве ці не сто гадоў таму паставілі. А на гербах гарадоў розных краін ёсць выявы гэтай працавітай жывёліны: у Германіі — на гербе Беверка, у Нарвегіі — Омпі, Швейцарыі — Бібірштайна, у Польшчы — Ломжы, у Расіі — Іскіціма, Францыі — Ветроны...

Другой публікацыяй, якой журналісты «Алімпійскай газеты» вырашылі пракаментаваць надзвычайную падзею, аказалася інтэрв'ю вядомага выратавальніка

Міхася Сяргеевіча Палескага. Максімка чуў пра гэтага чалавека і раней. Ведаў, што менавіта Палескі зрабіў шмат дзеля таго, каб вярнуць у краіну даўно зніклыя балоты. Яшчэ ў трэцім класе на ўроку «Шануй прыроду!» лекцыю пра гэта чытала вучаніца Палескага — маладая настаўніца Арэса Паўлаўна Любанская. «...Спыняючы Пціч, мы зможам паспрабаваць выратаваць спартсмена. Човен і сам Собаль досыць сур'ёзна экіпіраваныя. Гумавая куртка, у якую апрануты спартсмен, у час небяспекі сама надзімаецца і пераўтвараецца ў сапраўдную гумавую лодку. Апрача гэтага, гаспадар прымацаваны да чоўна лёгкімі замкамі. У час небяспекі, калі човен можа перавярнуцца, спартсмен паспее выскачыць у ваду ў сваёй куртцы-лодцы. Але раменьчыкі ад замкоў расцягваюцца на некалькі метраў. І пры неабходнасці гаспадар можа ізноў вярнуцца да чоўна. У выпадку з Собалем мне цяжка пра нешта дакладна меркаваць. Але думаю, што вір, які закруціў човен Собаля,— і гэта было запісана на стужку, пакуль не адлучыліся тэлевізійныя камеры, прабіў рачное дно і ўцягнуў туды, у зямную кару, спартсмена. Але так гэта ці не, мы даведаемся толькі тады, калі абязводзім раку».

Разважаючы над выказваннямі вядомага выратавальніка, Максімка спрабаваў сабе ўявіць, а што ж зараз робіць спартсмен. Мо ён і сам спрабуе неяк выбрацца з рачной каламуці ці адтуль, з глыбіні зямной? Вядома, Собаль — чалавек незвычайных фізічных здольнасцяў. У гэтым сумнявацца не даводзіцца. Але і зямля, і вада валодаюць сілай незвычайнай. Не заўсёды чалавек можа адолець іх.

## Падказкі ад дзеда Усяведа

**Пціч** — рака ў Беларусі, нясе свае воды на працягу 421 км па Міншчыне, Магілёўшчыне, Гомельшчыне. Пціч — правы прыток ракі Прыпяць, якая ў сваю чаргу ўпадае ў Дняпро. Пачынаецца рака за 1 км на захад ад вёскі Нарэйкі Дзяржынскага раёна, на Міншчыне. У час веснавога разводдзя частка вады з Пцічы пераліваецца ў раку Свіслач — праз Цітаўку і Трэмлю.

## НЕСПАДЗЯВАНАЯ ЎВАГА КУБІНСКІХ ФІЛАТЭЛІСТАЎ




*Знаёмства са свежай паштовай карэспандэнцыяй. Краязнаўчы сайт Дудуткі.бай. Ліст ад прафесара Радрыгеса.*

...Максімка падышоў да паштовай скрыні і выцягнуў адтуль ладны стосік канвертаў. Калі б гэта адбылося, прыкладам, у чацвер, то хлопчык тут жа, ля ліфта, пачаў бы перабіраць пошту, адрасаваную бацьку, і ўважліва разглядаць чужаземныя маркі. Асабліва Максім любіў канверты, дасланыя з краін Лацінскай Амерыкі. Заўсёды філатэлісты з Венесуэлы

ці Бразіліі, Коста-Рыкі ці Перу радавалі нейкімі новымі аповедамі, дасылалі дагэтуль невядомыя маркі. У Бразіліі першыя маркі былі надрукаваныя 19 мая 1843 года. Максімка запомніў гэтую дату яшчэ таму, што тыя першынцы называліся «бычынымі вачыма» — з-за таго, што паводле формы кожная з марак нагадвала авал. Наступныя выпускі мелі не меней экзатычныя назвы — «казіныя вочы», «каціныя вочы»... Максімка і ягоны тата вялі сапраўдны пошук і адной венесуэльскай маркі, якая стала прычынай паштовай вайны паміж Вялікабрытаніяй і Венесуэлай. Да 80-годдзя вызваленчай барацьбы венесуэльскага народа ў 1896 годзе надрукавалі марку з партрэтам генерала Міранды. На мініяцюры была намаляваная і мапа — ды так, што частка тэрыторыі Брытанскай Гвіяны, прыналежнай на той час англічанам, апынулася ў межах Венесуэлы... Урад Вялікабрытаніі выступіў з пратэстам... Але пакуль такую марку, узрост якой роўны амаль двум стагоддзям, мінскім філатэлістам адшукаць не ўдалося.

Маркі, што прыляталі з Кубы, здавалася, прыносілі з сабою марскую прастору, зялёную лістоту дрэў і раслін, гарачыя шматколерныя малюнкі невядомай і далёкай краіны. Хаця, чаму невядомай? Разам з бацькам ці не штовечар Максім разглядаў ёмісты кубінскі альбом. Як быццам у падарожжа выпраўляўся за многія тысячы міль ад Беларусі. Матансас, Гуантанама, Сьера-Маэстра, Камагуэй і іншыя кубінскія гарады і гарадкі падаваліся хлопчыку не меней знаёмымі за Нясвіж ці Карэлічы. А яшчэ ў Максімкі была мара патрапіць у Коста-Рыку. Там, у сталіцы Сан-Хасэ, на другім паверсе мясцовага цэнтральнага паштамта месціўся Музей філатэліі. Між іншым, адзін з




нешматлікіх у свеце. Вось дзе хлопчык з задавальненнем правёў бы шмат часу...

Але сёння маркі адыходзілі на другі план. Усе хваляванні сышліся на адным: «Што здарылася на Пцічы? Ці жывы Собаль? Ці выратуецца вада Пцічы? Што будзе з бабрамі, рыбай?!. Што будзе з ракамі?!»

І за што сябе Максімка папікаў, дык гэта за тое, што не завітаў на сайт навін. На добра знаёмым усім Яндаксе мо і нічога не было б пра гэтую, як сяму-таму падаецца, шараговую падзею. А вось іншая справа — сайт Дудуткі.бай. Яго стварылі зусім нядаўна — да стагоддзя славутага музея, што ўрачыста адзначалася летась усёй краінай. Як і напрыканцы 20 стагоддзя, паблізу Пцічы ўзвышаліся стылізаваныя пад глыбокую даўніну хлебапякарня, вятрак, сыраварня, лядоўня, карчма, сялянскія свірны, адрыны і хлявы, кузня і сталярная майстэрня. А яшчэ ля самай ракі быў упарадкаваны стары водны парк. На другім

беразе Пцічы — прыгожая, абкладзеная шыкоўным хваёвым бярвеннем, крыніца. Яна вядомая яшчэ з часоў паноў Ельскіх, што гаспадарылі ў Дудзічах, суседнім Замосці на працягу ўсяго 19 стагоддзя... Сайт меў прыгожую застаўку: партрэты кампазітара Міхала Ельскага і гісторыка Аляксандра Ельскага. Аўтар іх — мастак Уладзімір Стальмашонак. Максімка ведаў ад бацькі, што і Ельскія, і мастак — з даўніх часоў знакамітасці нашай Айчыны. А яшчэ — стары герб Ігумена, колішняга цэнтра павета, куды і дудзіцкія ваколіцы ўваходзілі. Цяпер Ігумен называецца Чэрвенем. Герб — яскравае блакітнае поле, дзе над залатым снапом кветак лётаюць пяць пчол.

— Абавязкова зазірну на Дудуткі.бай,— уголас даў сабе заданне Максім.— А пасля патэлефаную тату на смартфон... Мо ён знойдзе хвілінку і паразмаўляе са мною?.. Нешта ж трэба рабіць!..

Хлопчык паклаў на драўляны столік у калідоры стос паштовых канвертаў. Распрануўся. Забег у ла- зенку, каб памыць рукі. І адразу — у татаў кабінет. Улучыў камп'ютар, наладзіў сеціва. Набраў патрэбную назву... Пакуль адчынялася электроннае вакенца, усё ж вярнуўся ў калідор, забраў пошту і свежы нумар «Алімпійскай газеты». І як толькі погляд спыніўся на верхнім канверце, Максім ажно знерухомеў пасярод пакоя. Увагу прыцягнула дзіўная паштовая марка. Паводле надпісу — кубінская. Год выдання — 2094... Кароткае тлумачэнне на іспанскай мове, нават і на пераклад ніякія высілкі не патрэбныя: зразумела, што марка з выявай ветрака выйшла да 100-годдзя з дня заснавання Музея матэрыяльнай культуры «Дудуткі». Ну і дзіва!.. Знарок не прыдумаеш — усё ў адзін дзень! І човен з лепшым грабцом

краіны знікае ў нікуды на Пцічы каля Дудзічаў, і ліст сёння ад кубінскага філатэліста прыходзіць з маркай да юбілею музея «Дудуткі» — ён размешчаны за нейкі кіламетр ад вёскі Дудзічы. «Не, нешта тут не так! — захваляваўся Максім.— Трэба тэлефанаваць тату!..»

## Падказкі ад дзеда Усяведа

**Куба** — дзяржава ў Вест-Індыі. Размешчана на астравах Куба, Хувентуд і на некалькіх суседніх астраўках і рыфах. Сталіца — Гавана.

«**Дудуткі**» — музей матэрыяльнай культуры, які ў 1994 годзе заснаваў паблізу вёскі Дудзічы пісьменнік і прадпрымальнік Яўген Будзінас. У розныя гады на тэрыторыі музея пастаўлены драўляны вятрак, пабудаваныя кузня, сыраварня, хлебапякарня. Тут можна не толькі дзівіцца даўнінай, але і паспрабаваць сябе ў ролі каваля, ганчара, пекара.



**Дудзічы** — вёска на Пухавіччыне. За сорак кіламетраў ад Мінска. Радзіма братоў Аляксандра і Міхала Ельскіх, скульптара Карла Ельскага. Вядомасць сваю мае з 1600 года. З 1785 года належала панам Ельскім. У вёсцы ў 19 стагоддзі былі драўляная Пакроўская царква, батанічны сад, аранжарэя.

**Ельскія** — шляхецкі род у Вялікім Княстве Літоўскім герба «Пелеш». Вядомы з канца 16 стагоддзя. З гэтага роду паходзяць вайскоўцы, асветнікі, мастакі, дзяржаўныя чыноўнікі.

**Міхал Ельскі** — родны брат Аляксандра Ельскага. Кампазітар, скрыпач, музычны пісьменнік. Нарадзіўся ў Дудзічах у 1831 годзе. Аўтар многіх музычных твораў: паланэзаў, санат-фантазій, мазурак, мініяцюр. Аўтар працы «Народныя танцы Мінскай губерні». З канцэртамі аб'ездзіў многія краіны Еўропы.

**Аляксандр Ельскі** — гісторык, этнограф, краязнавец. Нарадзіўся ў маёнтку Дудзічы ў 1834 годзе на Пухавіччыне. Пражыў доўгае жыццё. Памёр у 1916 годзе. Стварыў унікальны прыватны музей, які месціўся непадалёк ад Дудзічаў у маёнтку Замосце. Сабраў некалькі цікавых калекцый — прадметаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, карцін, аўтографаў знакамітасцяў з усяго свету, а таксама вялікую бібліятэку. Аб'ездзіў усю Беларусь і напісаў некалькі тысяч артыкулаў пра паселішчы Беларусі. Імі карыстаюцца і да гэтага часу, каб даведацца нешта забытае пра даўніну беларускіх гарадоў і мястэчак.

# ТАТАВА ПАРАДА



*Навіны — толькі пра Собаля. Акадэмік Градаў і прафесар Свіслацкі баяцца экалагічнай катастрофы. Эрнэста Радрыгес — сапраўдны сябра беларускай прыроды.*

...На экране камп'ютара высвеціліся Дудуткі.бай. Хлопчык набраў у ваконцы прозвішча спартсмена, які згубіўся на рачной дыстанцыі. Навін на гэтую тэму было звышдастаткова. Аказваецца, пра ўчарашнюю падзею напісалі ці не ўсе газеты краіны. Максімка хуценька прагартаў іх электронныя сайты. Пра тое, якім чынам некаторыя выратавальнікі мяркуюць шукаць Собаля, расказвалася ў паведамленнях «Радыё “Вады”». І хаця гэтая радыёстанцыя працуе ў жывым эфіры і размяшчае ў сеціва свае паведамленні не болей за дзесяць гадоў, яе слухае, відаць, уся краіна. А мо нават і ў суседніх краінах ёсць слухачы ў «Радыё “Вады”». Аўтарытэт свой радыёстанцыя займела найперш таму, што звяртае асаблівую ўвагу да трывожнай сітуацыі, што складваецца ў свеце з вадою. А сёння ж каля ста краін свету адчуваюць недахоп прэснай вады. Дэфіцыт заўважны нават у 300 гарадах Кітая — краіны, якая досыць імкліва развіваецца і здольная

вырашаць многія праблемы. Што ж, агонь — бяда, і вада — бяда, а горш бяды — быць без агню і без вады.

...«Радыё "Вады"» сёння з самай раніцы правяло пасяджэнне з удзелам акадэмікаў, вядомых не меней за паважаных аўтараў «Алімпійскай газеты». Абмеркаванне тэмы Пцічы зусім не нагадвала дыскусію. Ці не ў адзін голас паважаныя навукоўцы казалі, што такія меры прывядуць не проста да засухі, а да сапраўднай катастрофы. Акадэмік Градаў нагадаў цікавыя гістарычныя факты: «...болей як адзінаццаць стагоддзяў назад у Рускай Зямлі — мо пад гэтай тэрыторыяй тады мелася на ўвазе і наша Беларусь — была незвычайная засуха. Загінулі пасевы ў многіх княствах. А летапісы таго часу наступныя характарыстыкі выдалі: «Жары вельми тяжкие». І яшчэ: «Сухмень велика и знойно добре». Засуха ахапіла і Заходнюю Еўропу. Дажджы проста зусім пераcталі ісці... Перасохлі рэкі. Што цікава, праз пяць гадоў бяда паўтарылася ізноўку. А следам — праз год, у 1000-м,— па ўсім свеце прайшлі землятрусы. Гэтую дату — 29 сакавіка — доўга памяталі ў многіх пакаленнях нашых прашчураў. Разбуранымі апынуліся незлічоныя тысячы драўляных і каменных будынкаў...» Прафесар Свіслацкі вось пра што нагадаў: «...Пэўна ж, усе памятаюць, якіх сіл нашаму грамадству каштавала ачышчэнне Свіслачы, асабліва на гарадскім яе ўчастку. Я нават прозвішча змяніў у гонар выратавання прыгожай ракі — цяпер нашу імя Свіслацкага, чаму і бясконца рады. Кожная з малых і вялікіх рэк жыватворна ўплывае на прыроду Айчыны, на стан яе зямлі, на ўрадлівасць нашай глебы, нават, калі хочаце, на прыгажосць і колер неба, на паветра не толькі на лузе, але і ў лесе...»

Максімка пагаджаўся з усім, што казалі разумныя людзі. Але і не мог не думаць пра лёс Собаля. Ён і зараз стаяў у хлопчыка перад вачыма — магутны, з напружанымі біцэпсамі, вясляр. Як жа яго выратаваць?!. Максім усё ж набраў нумар сотавага тэлефона таты.

— Слухаю цябе, сынок,— адгукнуўся ў слухаўцы татавага далькажыка знаёмы голас.

— Тата, ты чуў што-небудзь пра ўчарашнюю трагедыю на Пцічы?

— Так, у нашым канструктарскім бюро толькі пра гэта і гавораць. Ты, відаць, зараз шукаеш навіны на Дудутках.бай? Дарэчы, як толькі я вярнуся дахаты, звяжамся па электроннай пошце з кубінскім прафесарам Эрнэста Радрыгесам, які, хаця і жыве на востраве Куба, займаецца вывучэннем менавіта рэк. Вакол — акіян, а ён, дзівак, даследуе рэкі. Дакладней — іх гісторыю. Прычым не толькі на Кубе, у Амерыцы, але і ва ўсім свеце. Эрнэста дасылае мне не толькі маркі Кубы, але і свае кнігі. Апошняя з іх уяўляе сабою першы том шматтомнай энцыклапедыі «Рэкі свету». Ведаю, што над ёю прафесар рупіцца ўсё сваё жыццё. Што цікава, артыкулы пра рэкі пабудаваныя так, што там ёсць не толькі агульныя звесткі пра даўжыню, глыбіню, хуткасць плыні. У кожным з нарысаў пра рэкі ёсць яшчэ і розныя даўнія гісторыі, легенды, паданні, на якія часам ужо і забыліся... Я вось што падумаў, а можа быць, там ёсць нешта і пра Пціч, яе таямніцы...

Максімка ўважліва выслухаў гэты аповед і адразу ж прыгадаў кубінскі ліст:

— Татка, а сёння акурат прыйшоў ліст з Гаваны. На канверце — паштовая марка ў гонар Музея «Дудуткі». Дарэчы, з малюнкам ветрака...

— Дзіўнае супадзенне! Я даўно чуў пра гэтую серыю. Відаць, Эрнэста і даслаў у канверце ўсе маркі, прысвечаныя музею, гісторыі Дудзічаў. Можаш зазірнуць у канверт... І чакай мяне, мы сёння будзем доўга падарожнічаць у часе і прасторы...

Тэлефон замоўк... Максімка ж не мог спакойна сядзець. І лёс Собаля, і лёс ракі непакоілі яго ўсё болей і болей.

## Падказкі ад дзеда Усяведа

**Летапісы** — гістарычны жанр старажытнай літаратуры. Запіс звычайна пачынаўся: «в лето...» (значыць: «у годзе...»). Таму і назва — летапісы. У Беларусі летапісы пачалі складацца ў 12—14 стагоддзях. Гістарычныя запісы вяліся ў Пінску, Слуцку. Вядомыя Смаленскі летапіс, Аўрамкі летапіс і іншыя тэксты, знаёмства з якімі дапамагае навукоўцам адкрываць даўнюю гісторыю.

**Энцыклапедыя** — навуковы даведачны дапаможнік, зборнік навуковых звестак і даведак на розныя тэмы, адрасаваны для шырокага кола чытачоў. У Беларусі яшчэ ў 20 стагоддзі выйшла шматтомная ўніверсальная беларуская энцыклапедыя. Яна склала 12 тамоў. Ёсць галіновыя энцыклапедыі, а таксама персанальныя і рэгіянальныя. У Беларусі персанальныя энцыклапедыі прысвечаныя Францыску Скарыне, Янку Купалу, Максіму Багдановічу.

**Рэкі свету** — прыродныя вадзяныя патокі, якія цякуць у выпрацаваным паглыбленні. Рэкі сілкуюцца за кошт вады з паверхні і падземных крыніц. Найвялікшыя рэкі свету: Амазонка — працяг-

ласцю 7100 кіламетраў, Ніл — 6650, Янцзы — 5800, Місісіпі з Місуры — 5969, Хуанхэ — 5464, Амур — 4440 кіламетраў. У Беларусі найболей вялікія рэкі — Дняпро, Дзвіна, Нёман, Прыпяць, Бярэзіна.

## ПАДАРОЖЖА Ў ЧАСЕ




*Кубінскія маркі апавядаюць пра Беларусь. Дзівоснае паштовае адкрыццё... крыніцы паноў Ельскіх. Новая прастора.*

Максім дастаў нажніцы, акуратненька абрэзаў канверт з аднаго боку. І выцягнуў адтуль складзены ўдвая аркушык. Ліст хлопчык не стаў чытаць, а паштовыя маркі выклаў на стол ля камп'ютара. Серыя складалася з пяці мініяцюр. Адна з іх паўтарала тую марку, якая ўпрыгожвала канверт. На другой, коштам у 3 сентава,— «дудуткаўскі» млын. На трэцяй, яшчэ болей дарагой — у 5 сентава, быў намаляваны маёнтак Аляксандра Карлавіча Ельскага ў Замосці: звычайная, як па сённяшнім часе, драўляная хата. Мо крыху большая, даўжэйшая за тыя аднапавярховыя дамкі, што захаваліся на фотаздымках з альбома Максімавага прадзеда альбо на тых паштоўках з падручніка Уладзіміра Аляксеевіча Ліхадзедава,

па якім яшчэ ў трэцім класе школьнікі сталіцы вывучалі прадмет «Пра Беларусь апавядаюць старыя паштоўкі». Чацвёртая — праваслаўная, Пакроўская, царква ў Дудзічах. Пятая, і каштуе яна даражэй за іншыя — 15 сентава, асабліва ўразіла хлопчыка. На марцы — крыніца сядзібы Ельскіх. Праўда, яна не зусім такая, якая была вядомая Максіму з экскурсіі ў «Дудуткі». На выяве не было той дахоўкі, што ўзвышалася зараз. Бярвенцы, здаецца, ураслі ў зямлю. Цікава, дзе кубінскія паштары знайшлі такую выяву?.. Наагул не так і шмат фотаздымкаў засталося, звязаных з родам Ельскіх і іх сядзібамі ў Дудзічах і Замосці.

Хлопчык доўга ўглядаўся ў малюнак крыніцы. Праз якую хвіліну хлопчыку падалося, што ад кавалачка паперы павеяла асаблівай прахалодай. Юны філатэліст прыгадаў загадку пра крыніцу: «Чыстае, харошае, цэлае лета цвіце, а насення няма».

Раптоўна — на крайні выпадак так падалося хлапчуку — празрыстая блакітная крыніца захвалявалася, ажыла. Па воднай паверхні пабеглі цені, а насамрэч яны аказаліся... літарамі. Максіму карцела сябе ўшчыкнуць. «Няўжо такое можа быць? Як гэта так — на кубінскай марцы літары выкладваліся ў беларускія словы...» Неверагодна здзіўлены, Максімка чытаў уголас:

— «Таямніцы раскрываюць крыніца…— Кожнае слова было выпісана ў асобны радок. Па нейкім часе ўвесь слупок пераўтвараўся ў хвалі. А следам выраслі новыя словы. Яны, трапяткія, дрыготкія, не адразу станавіліся зразумелымі: — ...паноў Ельскіх, рака Пціч. Адгадку хаваюць архівы...» І што далей? Няўжо маркі могуць так усё перавярнуць?..




# Таямніцы раскрываюць крыніца

Максімка, які з самага маленства быў прывучаны не спяшацца з рашэннем, крыху разгубіўся. Падзеі, што адбываліся вакол яго, хаця і падаваліся не зусім зразумелымі, усё ж штурхалі да нейкіх дзеянняў, прымушалі рухацца. Але куды, у які бок ісці?.. Хлопчык яшчэ раз пільна ўгледзеўся ў блакітныя, сінія і іншых колераў адценні, ва ўсю шматфарбнасць самай дзіўнай на свеце з марак, што траляліся яму за ўсё жыццё. Тата апавядаў пра дамініканскія паштовыя мініяцюры, з-за якіх разгарэліся памежныя спрэчкі: на малюнках марак Дамініканскай рэспублікі ў 1900 годзе мастакі «адцяпалі» частку Гаіці. «Філатэлістычныя наступствы» мелі і войны 1879—1883 гадоў паміж Чылі, Перу і Балівіяй. Узгадаў і «паштовую вайну» паміж Вялікабрытаніяй і Венесуэлай... Але каб маркі былі тэлеграфам, ды яшчэ гістарычным!.. Такое ўявіць цяжка!..

## Падказкі ад Дзеда Усяведа

**Сентава** — дробная разменная манета на Кубе. Адзін сентава — адна сотая частка аднаго песа.

**Кошт маркі** — гэта пазнака, надрукаваная на паштовай марцы, якая адлюстроўвае грашовую суму, на якую будуць аказаныя паштовыя паслугі, калі вы прад'явіце менавіта гэтую марку.

**Крыніца** — выхад падземных вод на зямную паверхню на сушы альбо пад вадою. Бываюць крыніцы прэсныя і мінеральныя. Паводле тэмпературы крыніцы падзяляюць на цёплыя і халодныя, кіпячыя і гарачыя.

## ЗНАЁМСТВА З ЛЕКАВІКОМ



*На «дудуткаўскім» млыне. Знаёмства з жывым гербарыем Ельскіх. Клопаты Лекавіка. Цудадзейная сіла крынічнай вады.*

Чым далей углядаўся Максім у крынічны блакіт, тым болей апынаўся ў палоне невядомай прасторы. У нікуды сыходзілі сцены пакоя. Прыадчыняліся новыя, дагэтуль незнаёмыя краявіды. Хаця, не... Нешта ўсё ж Максіму падавалася і вядомым. Уважліва агледзеўшыся, хлопчык зразумеў, што знаходзіцца

на беразе воднага парку ў дудзіцкай сядзібе Ельскіх. Крыху, праўда, тузанала плечы. Як быццам восеньскі замаразак прабег па спіне. Але, зірнуўшы ўгору, Максімка пабачыў светлае неба. Сонечныя праменьчыкі прабіваліся скрозь лістоту высокіх дрэў. Што ж, восень — на дню пагод восем. Хлопец яшчэ колькі хвілін аглядаўся наўкола, ловячы тварыкам вераснёўскае сонейка. Ці не пра яго такую загадку даўным-даўно прыдумалі: «У горадзе-гарадзе плыве талерка па вадзе?..» Максімка і іншую загадку пра сонейка ўспомніў: «Ні стучыць, ні гручыць — у ваконца глядзіць...»

Хлапчына затрымаўся вачыма на магутным асілку-дубе. Поруч з ім нячутна гушкала свае галінкі прыгажуня-рабіна. За лічаныя метры ад яе схавалася яшчэ адна сястрычка. Ды лістота, якая набрала ў сябе фарбаў, тыя ховы выдае з галовай. А вось і ўзноўлены музейшчыкамі млын.

На млыне, відаць, нікога гэтым разам не было. Яно і зразумела: большасць экскурсій ужо мінула. А млын для іх і працуе — каб паказаць, як жа раней, дзвесце-трыста гадоў таму, збожжа пераўтваралася ў муку. Праўда, Максімку падалося, што на коле, бліжэй да вады, сядзіць нейкая дзяўчына. Падышоў бліжэй: «Няўжо русалка?!.» Дзяўчына павярнулася да хлопчыка тварам, страсянуўшы доўгія прыгожыя валасы. Максімка спужана азірнуўся па баках, а пасля павярнуў на сцяжынку, што вяла да лугавіны. Праз хвіліну-другую апынуўся на велізарнай прыгожай паляне, запоўненай кветкамі.

«Дык гэта ж прыродны гербарый, створаны Ельскімі! Толькі кветкі ў адрозненне ад засушанага гербарыя тут сапраўдныя, жывыя»,— узгадаў Максімка

даўнюю экскурсію па «Дудутках». І адразу вымушаны быў азірнуцца. За спінаю ў хлапчаняці пачулася выразнае пакрэхтванне. Павярнуўся і апынуўся проста перад сівенькім дзядком, які прыладаваўся на вялізным валуне на ўскрайку паляны. Невысокага расточку, ладны не па гадах. І з твару, пакрытым сівой барадою, дужа прыязны.

— Ты хто? — усё ж трывожна запытаўся Максімка.

— Клічуць мяне Лекавік! Так і жыву тут, сярод лекавых траў, кветак, якія сабраныя разам з-за пільнасці і дбайнасці разумнага пана Ельскага. І мяне шаноўны Аляксандр Карлавіч, выпадкова пабачыўшы на лузе каля Азярычына, запрасіў сюды, на незвычайную паляну. Тады шмат якія травы і многія кветкі-прыгажуні былі зусім незнаёмыя насельнікам мясцовых паселішчаў. І Аляксандр Карлавіч вельмі перажываў, каб людзі не нашкодзілі самі сабе, блытаючыся ў лекавых травах. Здараецца ж, адну хваробу каторая лекавая кветачка і лекуе, а другой спрыяе... А іншаму чалавеку, у якога некалькі хвароб сышліся, дык і лекі трэба адмысловыя, з тых, што іншым не падыходзяць... Вось я і апякуюся, каб такая прыгажосць бяды не нарабіла. А што да пана нашага, то ён усё на карысць грамадзе імкнуўся рабіць, для люду мясцовага стараўся. Гэта пра яго, Ельскага, казаць трэба: «Свая сярмяжка няцяжка...» І такая ўжо мілосць была ва ўсе гады сярод «гербарыя Ельскага», што, здаралася, і пакідаць гэтую мясціну не хацелася. Зробленае, выгадаванае Ельскім, падгледжанае ім у простага люду і з кніжак выведанае, акурат і спрыяла таму, што мясціна гэтая не іначай як святой палянай падавалася. І жыхары Дудзічаў, Замосця, іншых



панадпцічанскіх вёсак так упадабалі адпачынак сярод кветак, што часам ледзьве я паспяваў і схавацца тут альбо ў іншую мясцінку збегчы.

— А вы хіба не ўвесь час тут жывяце? — асвойтаўшыся і супакоіўшыся, Максім перайшоў на

«вы», так, як і трэба заўжды звяртацца да дарослых і незнаёмых людзей.

— Не, Максімка, прапіска ў мяне па трох адрасах.

— ???

— Дзівішся, што ведаю, як цябе клічуць?.. А я шмат чаго ведаю. У галаве маёй, як і ў кнізе: усё там — і зямля, і неба, і вада. І ведаю, чаму ты сюды з гарадской мітусні прыляцеў... Але ж ты пытаешся пра маю прапіску. Меў бы пашпарт, то адразу тры адрасы ў ім было б: на паляне — валун вось гэты, бліжэй да ракі — млын, а яшчэ — лазня ў халоднае надвор'е, у лютую зіму. Служба мая — пры травах і кветках. А вось адпачываю ля млына, на млыне. Часам нават з



Вадзянікам спрачаемся, каму на коле спаць. Словам, ёсць вада — п'ю віно, вада ўцячэ — вінцо адляціць...

— Вось і ў вас клопат за ваду. Без яе і млын не млын... А што ж будзе, калі вада сыдзе з ракі?.. І якая пасля таго Пціч рака?

— А ты ведаеш, чаму наша рака такую назву мае — Пціч?.. Яна ж да птушкі падобная — пакручастая, хуткаплынная... Здаецца, вось-вось у вырай паляціць...

— Прызнаюся, што чую пра гэта ўпершыню. Але, даражэнькі Лекавік, хвалюе мяне не толькі лёс ракі, але і лёс весляра Собаля, які знік у таямнічым віры, знік разам з чоўнам, на якім змагаўся за перамогу. У ратавальнікаў ёсць думкі, меркаванні, што дзеля гэтага варта спыніць раку...

Лекавік абхапіў сваёй стомленай вузлаватай рукою сівую бараду. Вострым пагглядам вачэй нібыта працінаў хлопца наскрозь. Максім адчуў, як хутчэй затахкала сэрца, часцейшымі сталі ўдары пульсу.

— Мілы дружа, даспадобы ты мне сваім перажываннем за людзей, тваім болем за раку, які ў цябе сядзіць унутры. Ды не буду болей хвалу табе спяваць. Бо, шчыра кажучы, тады слова срэбра, калі справы — золата. А ратаваць добрых людзей — першы і галоўны мой клопат.— Лекавік пазіраў проста ў вочы хлапчаняці.— Але рабіць гэта трэба з розумам, каб іншым не нашкодзіць. І вада ж жыць хоча! Навошта спыняць раку?!. Трэба толькі паспрабаваць выратаваць таго чалавека на чоўне... Мне падаецца, што клопат у нас агульны. І ўсю працу трэба па чарзе зрабіць... Вось мяркуй, Максімка, сам, што будзе, калі мы такі план выбудуем. Спярша трэба пранікнуць у тыя лёхі, куды неўтаймаваная вада занесла весляра.



Пасля — ажывіць спартсмена. І толькі затым вярнуць на бераг Пцічы.

— Усё правільна кажаце. Але ж лёгка сказаць... Як жа гэта ўсё зрабіць?

— Усяго не ведаю і я. У адным упэўнены дакладна: нам мусяць дапамагчы крыніца і самі Ельскія. І табе, наколькі я магу прачытаць у тваіх думках, ужо быў знак на тое... Цудадзейная сіла крынічнай вады, як бачу я за шматлікія леты і зімы, што жыву ў гэтай старонцы, многім спрыяла ў ратаванні здароўя, многім сілы давала на самыя розныя здабыткі і здзяйсненні. А як дабрацца да весляра — пра гэта давай паспрабуем запытацца ў саміх Ельскіх...

— Хіба ж гэта магчыма — Ельскіх, якія гаспадарылі ў дудзіцкай старане два стагоддзі таму, даўно няма сярод жывых...

— Затое ёсць сабраныя імі веды і памяткі. Важна толькі ўмела іх скарыстаць. Але не будзем губляць часу і пойдзем да крыніцы.

Лекавік прыўстаў з валуна. Махнуў рукою, запрасіўшы за сабою Максімку. А дарогі тае сцежкаю праз луг-гербарый і пасля мастком праз Пціч і было ўсяго ды нічога — мо на нейкія паўгадзіны. Ля крыніцы, як ні дзіўна,— пуста. Прыгожы керамічны кубак з барэльефам майстра, што высякае ў круглым камені жорнаваў барозны, вісеў на адмысловым цвіку. І цвік той, і кубак зробленыя ў гонар таленавітага рамесніка,— усё гэта з «дудуткаўскіх» майстэрняў. Ганчары і кавалі тут нібыта праз стагоддзі сваё майстэрства пранеслі. Лекавік уважліва паглядзеў на Максімку:

— А я табе яшчэ адну загадку хачу падараваць...

— Дык загадкі ж не адгадкі...

— А вось адгадаеш, значыцца і новымі ведамі авалодаеш. А які падарунак за веды можа быць даражэйшым?.. Вось паслухай:

Нарадзіўся я ў цені бясконцым,
Не бачыў ні месяца, ні сонца;
Дабраліся да мяне людзі,
Прабілі наскрозь мне грудзі,
Жалезным абручом падпаясалі
І танчыць казалі.

— Дык гэта жорнавы камень, жорны,— усцешыўся Максімка.

Хлопчык зачэрпнуў чысцюткай як сляза вады. Выпіў палову кубка. Хацеў было паставіць на дол пасудзіну, каб перавесці дыханне. Але ўзмахам рукі Лекавік перапыніў хлапчука. Максімка маўкліва дапіў сцюдзёную ваду.

— Цяпер ты набраўся моцы — і многія справы табе падуладныя.— Лекавік раптоўна пачаў драбнець і знікаць літаральна на вачах. Хлопчык хацеў яшчэ

нешта запытацца, але не паспеў. Данёсся толькі зусім сцішаны голас: — Азірніся вакол крыніцы і астатнія таямніцы ты адкрыеш сам. Глядзі ўважліва, разважай настойліва.

## Падказкі ад Дзеда Усяведа

**Вадзяны млын** — мукамольны млын, які прыводзіўся ў рух энергіяй вады. Будаваўся на беразе ракі ці праточнага возера. Паўстаў з пары круглых апрацаваных камянёў з вертыкальнай воссю кручэння — асноўны рабочы орган ці механізм. Верхні камень прыводзіўся ў дзеянне ад вадзянога кола — сілай вады, якая падала.

**Гербарый** — калекцыя засушаных раслін. Здараецца, што гербарыем называюць і жывы раслінны асяродак, дзе наўмысна сабраныя віды самых розных раслін. Прыклад — «жывы гербарый» Аляксандра Ельскага.

**Жорны** — ручны млын, які складаецца з двух гладка абчэсаных круглых камянёў, з дапамогаю якіх зерне перацціраецца на муку.



# РАШЭННЕ ПАДКАЗВАЕ КУБІНСКІ ПРАФЕСАР



*У памагатых — камп’ютар, які чытае думкі. Электронная размова са спадаром Радрыгесам. Знойдзены феналагічны дзённік Ельскіх! Пціч — любімая рака прафесара з Гаваны. Таямніцу падказваюць запісы Ельскіх. Максімка ведае, што трэба рабіць!*

Максімка прыўзняў галаву. Леварук ад крыніцы стаялі велізарныя драўляныя слупы. Яны трымалі на сабе ўкладзеную ў дубовую раму металічную мапу. Фарбамі, якія, пэўна ж, не баяліся ні снегу, ні дажджу, былі нанесеныя назвы гарадоў: Варшава, Кракаў, Санкт-Пецярбург, Масква, Вільня, Калінінград, Прага, Львоў, Мінск, Івана-Франкоўск, Луцк, Астрог, Пскоў, Рыга...

Гэта былі адрасы, дзе дакладна альбо магчыма захоўваліся вялікія і малыя часткі колішніх багатых гістарычных архіўных і калекцыйных збораў Ельскіх. Была на металічнай мапе і адна чырвоная лямпачка, што бясконца мігцела. Подпісаў пад ёю — ніякіх. Але затое мелася на мапе і рысачка, што падводзіла да пафарбаванага ў мяккі арабінавы колер невялікага

экрана. Над ім гарэла табло: «Пароль». Максімку доўга не давялося ламаць галаву. Ці то Лекавік неадступна сачыў за кожным ягоным крокам, ці то крынічная вада спрыяла... Але досыць было падумаць: «Таямніца музея Ельскіх» — як бялюткай чысцінёю засвяціўся экран надкрынічнага камп'ютара. Хлопчык пабачыў знаёмы сайт Дудуткі.бай. Падумаў: «Як выратаваць Собаля?» У акне сайта з'явіліся наступныя словы: «Адгадкі прыходзяць удзячным». Максім зразумеў, што ён вядзе электронны дыялог з суперкамп'ютарам, які здольны чытаць думкі. Але, відавочна, суразмоўца хлапчука знаходзіцца яшчэ на такім узроўні, калі не ўспрымае доўгіх разважанняў, а працуе з лаканічнымі і кароткімі думкамі. Максім «адправіў» новы сігнал: «Мне трэба патрапіць у пцічанскі вір, дзе згубіўся Собаль». Камп'ютар вытрымаў даўжэйшую за ранейшую паўзу і толькі тады «загаварыў»: «Шлях да гэтага ведае гаспадар феналагічнага дзённіка Аляксандра Ельскага». Што азначае феналогія, Максім ведаў з тых самых школьных урокаў «Шануй прыроду!». Нават сам спрабаваў з дня ў дзень запісваць звесткі пра тое, калі дождж ішоў ці выпадаў снег. А яшчэ — пра буйны град, які пазбіваў на бабуліным агародзе цыбулю. Такія назіранні, застаючыся на стагоддзі, дапамагаюць пасля ўзнавіць агульныя карціны клімату. Спрыяюць дакладнасці прагнозаў надвор'я. Але ж дзённік... «Назіранні Ельскіх даўно згубленыя...» Паўза атрымалася яшчэ даўжэйшай. У акне засвяцілася не зусім прыемная адзнака: «Некарэктнае сцвярджэнне». Максім спяшаўся думаць: «Інакай бы дзённікі былі надрукаваныя».— «Ты дзівіўся сёння, што «Дудуткам» і Ельскім прысвячаюць паштовыя маркі нават на Кубе...» — «Няўжо




прафесар Радрыгес нешта ведае?..» — «Я толькі магу звязаць цябе з Кубай. Астатняе высвятляй сам...»

Дудуткі.бай застракацелі рознакаляровымі малюнкамі. Недзе толькі праз хвіліну на экране ўсталяваўся вялікі фотаздымак. З яго проста на Максімку паглядаў незнаёмы дагэтуль чалавек, які сядзеў пры стале з камп'ютарам... Цяпер ужо размаўляць пачалі па скайпе...

— Будзем знаёміцца. Я — сябар твайго таты па філатэлістычных вышуках,— данеслася з экрана чысцюткая беларуская мова.— Клічуць мяне Эрнэста Радрыгес. Працую прафесарам Гаванскага ўніверсітэта. Нам не патрэбны перакладнік... Беларускую мову, як і астатнія дзесяць славянскіх, я ведаю дасканала. У нашым універсітэце асабліва шануюць незалежную

краіну Беларусь. І мы, кубінцы, няпроста, праз многія выпрабаванні дамагліся сваёй незалежнасці...

— Тата апавядаў, што вы займаецеся гісторыяй рэк, вывучаеце іх паводзіны ў самыя розныя часы.

— Так, і выдатна ведаю вашую Пціч. У мяне нават ёсць яе здымкі ў тых мясцінах, дзе рака найболей шырокая,— ля Дараганава і Парэчча. Гэта на Асіповіччыне, калі не памыляюся, і на памежжы Пухавіцкага і Старадарожскага раёнаў. Унікальныя паводле сваёй прыгажосці мясціны!

— Так, мне тата казаў, што яшчэ зусім нядаўна там вадзіліся велізарныя самы...

— Самы і зараз ёсць у многіх вашых рэках і нават азёрах... Дарэчы, гэта я і ўгаварыў кубінскую пошту выдаць серыю марак да юбілею музея «Дудуткі». Дзве рэчы мяне падштурхнулі. Па-першае, і ў нас надаецца ўвага ўзнаўленню даўніх асяродкаў. Як прыклад — індзейская вёска з маленькіх астравоў паблізу Кубы. Па-другое, год таму на аўкцыёне Сотбіс наш Гаванскі ўніверсітэт набыў у аднаго састарэлага польскага эмігранта сшытак з феналагічнымі назіраннямі, якія вяліся ў сям'і Ельскіх з даўніх часоў. Ужо колькі месяцаў я чытаю гэтыя запісы, расшыфроўваю «цёмныя мясціны». І буду ўсцешаны, калі мае разгадкі спатрэбяцца Беларусі, Польшчы, Расіі альбо іншай краіне славянскага свету... Трагедыя, што здарылася на Пцічы, калі добра падумаць, не такая ўжо і страшная. Я раскажу табе, як патрапіць у тую прастору, дзе апынуўся спартсмен. У феналагічным дзённіку Ельскіх ёсць і запісы з ранейшых першакрыніц, са старадаўніх летапісаў. Вось паслухай: «...потрясеся земля». Гэта — пра землятрус, які адбыўся ў ваколіцах Дудзічаў яшчэ на пачатку другога

тысячагоддзя. І тады па беразе Пцічы ўтвараліся расколіны. Досыць знайсці каторую з іх і, пераапрануўшыся ў гідралагічны касцюм, можна праз такую адтуліну ў беразе патрапіць у сапраўдную пячору, што ўтварылася пасля землятрусу. Вось мапа, якую склаў сам Аляксандр Карлавіч Ельскі.— На экране паказаўся выразны малюнак. Блакітнымі стрэлкамі былі пазначаныя тры ўваходы ў пячору.

— А як жа ажывіць весляра, калі я знайду яго? Не мог жа ён заставацца ў пячоры, дзе, відаць, і паветра не стае, гэтулькі часу жывым?..— запытаўся Максімка ў прафесара.

— На вялікі жаль, я гэтага не ведаю. Але думаю, што таямніца можа быць разгаданая на месцы. У запісах Ельскіх ёсць звесткі пра гаючую моц вады...

— Мусіць, размова пра крыніцу,— перапыніў хлопчык кубінскага прафесара.— Прабачце, спадар Эрнэста, мне трэба спяшацца. Дзякуй вам, што захавалі дзённік Ельскіх...

— Удачы табе, хлапчук!.. Калі ў цябе добрыя мэты, дык не сумнявайся, усё павінна атрымацца...

«Вось бы зараз знайсці Лекавіка!» — заклапочана падумаў Максімка. Нават вусны не разамкнуў, а сівенькі дзядок, абапіраючыся на сваю кавеньку, ужо стаяў поруч.

...— Бачу, хлопец, што ты нешта новае яшчэ адкрыў і ведаеш шляхі для выратавання шаноўнага спартсмена Собаля. У чым жа табе яшчэ патрэбная мая дапамога?..

— Прафесар Радрыгес казаў пра гаючую моц вады. Дык ці не крынічны бальзам ён меў на ўвазе?

— Хутчэй за ўсё так яно і ёсць. Але яшчэ невядома, колькі часу ты будзеш шукаць весляра. Ваду

з крыніцы трэба набраць у адмысловую біклагу. А яшчэ трэба пакласці ў ваду травінку, якая завецца жывінкай. Трава дапамагае надоўга захаваць жыватворную крынічную моц...

Атрымаўшы ад Лекавіка параду, а ў дадатак і прыгожую керамічную пляшку, Максімка набраў вады з крыніцы, паклаў у біклагу некалькі лісточкаў падараванай дзядулем травы і пайшоў на цэнтральную музейную сядзібу. Там, на станцыі пракату, назваўшы нумар і пароль да свайго грашовага рахунка, хлопчык узяў патрэбнага памеру гідралагічны касцюм. Ні ў кога асаблівай цікаўнасці гэта не выклікала. Праўда, гаспадар пракатнай станцыі папярэдзіў: «Калі хочаш яшчэ павандраваць у глыбінях Пцічы, паназіраць за яе падводным светам, то спяшайся, хутка, мусіць, і ракі такой не будзе...» — «Не спяшайцеся з дрэннымі прагнозамі, мы яшчэ паспеем выратаваць раку»,— падумаў хлопчык. Але на твары, відаць, думкі яго і выявіліся. Бо гаспадар станцыі, зразумеўшы, што сказаў нешта не тое, спахмурнеў і хуценька прычыніў дзверы за Максімкам.

## Падказкі ад Дзеда Усяведа

**Сотбіс** — аўкцыён, дзе па найвышэйшых коштах прадаюцца творы мастацтва, ювелірныя каштоўнасці.

**Феналогія** — навука, якая вывучае сезонныя з’явы ў жывой прыродзе, адсочвае сезонныя падзеі ў раслінным і жывёльным свеце, звязаныя са зменай пораў года і пагоднымі ўмовамі.

# ПЦІЧ ЗАСТАЕЦЦА З ВАДОЮ



*Максімка выпраўляецца ў пошукі. Сляды чоўна вядуць у падводнае царства. Сустрэча з Собалем. Раку ахоўвае Рыбнік. Прыязнасць экзаменатара. Максімка і Собаль вяртаюцца на бераг Пцічы.*

Патрэбнае месца на Пцічы Максім знайшоў досыць хутка. Там, дзе рака рабіла круты віраж, тоўпілася некалькі рэпарцёраў з фотаапаратамі. Па акрэдытацыйных картках было відаць, што ля ракі неслі сваю працоўную вахту ў чаканні нейкай асабліва важнай падзеі журналісты розных краін. На шчасце, не было тэлевізіёншчыкаў. Каб не прыцягваць да сябе лішняй увагі, Максімка пайшоў вышэй па рацэ. Абраў месцейка, прыхаванае высокай травою і невялікім лазовым кустом. Пераапрануўся і, трымаючы ля грудзей керамічную біклагу з крынічнай вадою, смела акунуўся ў ваду. Апусціўся бліжэй да рачнога дна і, перабіраючы ластамі, паплыў па плыні. Ліхтарыкам падсвечваў шлях, углядаўся ў сценкі берагоў. У адным месцы натыкнуўся на пафарбаваную ў два колеры — зялёны і чырвоны — трэсачку. Прыгледзеўшыся, пабачыў тры літары: «СОБ...». «Б» нават была крышачку абламанай. Юны шукальнік прыгод здагадаўся, што на вочы яму патрапіў

кавалачак вясла Собаля. «Значыцца, недзе тут усё і здарылася»,— падумаў Максімка. Уважліва прыгледзеўшыся, хлопчык знайшоў вузенькую адтуліну ў беразе. «І як жа туды можна было ўвайсці на чоўне...» Але варта было дакрануцца да карча, што вісеў над уваходам, як невядомая сіла падхапіла Максімку і літаральна закінула ў пячорную прастору. Падводнае царства засталося ззаду. Ніякай цемры! Светлы прасторны пакой! На сценах — прыгожыя, навюткія рыбацкія сеткі. Нераты, маленькія таптухі, крыгі, хапуны, кломлі — якіх толькі рыбацкіх прыстасаванняў тут не было. Стаялі ў куточку і восці з сям'ю ражкамі. Музей рыбалоўства, адным словам. Пасярод пакоя — човен з весляром, які стомлена паклаў галаву на рукі і,



здавалася, прыснуў на якую хвіліну. Максім падбег да весляра, на хаду расшпіліўшы свой касцюм на грудзях. Дастаў фляжку з крынічнай вадою. Набраў у далонь вады і змачыў ёю вусны Собаля. Максімку падалося, што спартсмен павёў плячыма. Тады хлопчык мацней прыклаў горла фляжкі да вуснаў весляра. І той пачаў піць усё большымі глыткамі. Прыўзняў галаву, паспрабаваў устаць, але нешта стрымлівала.

— А дзе вашая выратавальная куртка? — запытаўся Максімка.— Усе спадзяваліся, што вы выжылі дзякуючы спецыяльнай вопратцы, здольнай абмежаваць доступ вады...

— Усё адбылося так хутка, што я нічога не зразумеў. А трэба ж было пацягнуць матузок — і толькі тады мая куртка сталася б выратавальнай лодкай... Дарэчы, ты хто і як мяне знайшоў?

— Мяне клічуць Максім. Пра ўсё, што здарылася з вамі і як я сюды патрапіў, пазней пагаворым... А зараз трэба як найхутчэй вярнуцца на луг, выбрацца на бераг Пцічы і паведаміць, што вы жывы... Іначай, калі мы спознімся, Беларусь застанецца без Пцічы!..

— Ты нешта блытаеш, хлопчык. Такое ніколі не здарыцца... Рака — гэта не нейкая калюжына, якую можа высушыць сонейка!.. Рака нараджаецца аднойчы і застаецца назаўсёды... Яна жыве шмат, у мільёны разоў даўжэй за кожнага з нас паасобку.

— І ўсё ж будзем спяшацца...

Вясляр з асалодаю дапіў крынічную ваду. Максімка, разумеючы, што ўся адказнасць цяпер ляжыць на ім, ламаў галаву, шукаючы неабходнае рашэнне. Ён ужо нават падумваў пра тое, што трэба перадаць свой касцюм спартсмену. «Вось толькі, ці ўцісне цца ён у мой памер...»

Але думкі абарваў голас аднекуль з-пад столі. Уражанне складвалася такое, што прамаўлялі з дынаміка:

— Не хвалюйцеся... І ты, Максімка, не ламай галаву. Я дапамагу вам выбрацца адсюль. Але трэба адгадаць тры загадкі.— Голас падаўся хлопчыку да болю знаёмым. Але думкі перакінуліся на загадкі.— Слухайце: пузаты, чорны па вадзе плыве.

— Дык гэта ж човен! — усцешыўся хлопчык. Ён нават не думаў, хто гэта выпрабоўвае іх. Галоўнае — правільна даць адказ.

— Другая загадка... Воз без калёс, дарога без пяску, свішчом паганяе, на смерць паглядае.

Голас з-пад столі паказаўся Максімку падобным да голасу Лекавіка...

— Максімка, думай пра адгадку, я зусім не Лекавік,— прачытаў нехта невядомы думкі хлопчыка.— Хаця мы і блізкія людзі з тваім нядаўнім знаёмцам. Абодва з'явіліся ў гэтай старонцы ў часы Аляксандра Карлавіча Ельскага. Мяне клічуць Рыбнік. Ужо болей як два з паловай стагоддзі я нясу службу па ахове ракі. Даю людзям парады, як жыць у ладзе і згодзе з прыродай. Праўда, зараз часцей парады адрасую рыбам, самой рацэ, як з людзьмі жыць і як, калі на тое ёсць патрэба, ратавацца ад іх... Дык што, братка, з адгадкай?

— Воз без калёс — човен, дарога без пяску — рака, свішчом паганяць — вяслом правіць... Значыцца, адгадка — плысці на чоўне.

— Малайчына, хлопец. Відаць па ўсім, што хаця і гараджанін ты, а жыццё, прыроду ведаеш. Адгадаеш трэцюю загадку — і адразу будзеце з весляром на беразе. Толькі пакіньце мне човен. Хачу наглядзецца на яго. Моцы ён мне дадасць. Калі людзі ўважліва

ставяцца да мінуўшчыны, то мо і не ўсё страчана... Слухайце загадку... Прыйшоў хтось, узяў штось, пайшоў бы я шукаці, ды дарогі не знаці.

— І гэта я ведаю,— шчасліва закрычаў Максімка.— Чалавек і човен...

Хлапчаняці хацелася нешта яшчэ сказаць. Але тут закруціўся пакой. Відаць, адгадкі зрабілі сваю таямнічую справу... Вясляр і Максімка прыгарнуліся адзін да аднаго... І апынуліся на беразе. Сонечныя праменні лашчылі траву, дарылі свае зіхоткія кропелькі святла кветкам. Максім, знайшоўшы хованку ля лазовага куста, хуценька пераапрануўся. І разам з Собалем, трымаючы ў руках кавалачак вясла, пабег да журналістаў. А там ужо людзей было нашмат болей за тое, калі хлопчык уваходзіў у раку. Прыехала і тэлебачанне. А яшчэ на адной машыне буйнымі літарамі было выпісана: «Галоўны дэпартамент па зберажэнні водных рэсурсаў». Мажны сівы мужчына даваў інтэрв'ю групе журналістаў.

— Ужо прынятае рашэнне па спыненні Пцічы. Праз нейкіх дзесяць хвілін будуць зачыненыя ўсе шлюзы вышэй месца здарэння. А яшчэ праз некалькі гадзін можна будзе дакладна вызначыць шлях знікнення чоўна са спартсменам і распачаць канкрэтныя пошукі... Мы верым, што ў нас усё атрымаецца.

— Але ж я знайшоўся,— ззаду да купкі рэпарцёраў падышоў Собаль.

Гэта трэба было бачыць! Усе мікрафоны, тэлекамеры, фотаапараты, здаецца, раней сваіх гаспадароў павярнуліся да весляра. А Максімка пачаў праціскацца да кіраўніка выратавальнай аперацыі. Той намагаўся выглядаць надзвычай важна, але вонкава асаблівых сімпатый не выклікаў. Ды трэба ж некаму тэрмінова паведаміць, што раку чапаць нельга... І

нядаўні герой усіх магчымых рэпартажаў з ваколіц Дудзічаў, насуплены высокі начальнік ліхаманкава націскаў на кнопкі сотавага тэлефона. Праз лічаныя секунды ён ужо крычаў у слухаўку дальказжыка: «Тэрмінова спыняйце ўсе работы! Я забараняю чапаць раку!.. Мы ўжо і без таго выратавалі спартсмена!.. Аперацыя па выратаванні прайшла паспяхова! Неўзабаве вы пабачыце яго на экранах тэлевізараў! Собаль жывы і здаровы!.. Заданне кіраўніцтва выканана!»

Максімка шчасліва ўсміхаўся. Якая розніца, хто быў сёння галоўным выратавальнікам весляра Собаля і ракі Пціч. Шмат важней іншае: усё сапраўды скончылася паспяхова, найлепшым чынам.

## Падказкі ад Дзеда Усяведа

**Нерат** — рыбалоўная снасць, сплеценая з лазовых дубцоў. У выглядзе доўгага конуса з кароткім уваходам. Называюць нерат яшчэ і верша.

**Крыга** — рыбалоўная сетка. Складаецца з двух палазоў і шоста, які называюць дзедам. Да іх прымацоўваецца сетка з тоўстых нітак. Канцы палазоў злучаюцца так, што ўтвараюць любы кут. Рыбу лавілі крыгай утрох. Двое трымалі за канцы палазоў і цягнулі сетку, адзін з дапамогаю шоста прыціскаў сетку да дна. Каб праверыць улоў, палазы зводзілі разам і прыўздымалі крыгу над вадой.

**Таптуха** — рыбалоўная сетка. Звычайна: выгнутая дугой конусападобная прылада з адтулінай спераду, куды, паставіўшы сетку, і заганяюць рыбу. На лоўлю з таптухай можна ісці аднаму, памагатыя не патрэбныя.

**Кломля** — традыцыйная беларуская рыбалоўная прылада. Мае выгляд трохграннай прызмы, абцягнутай сеткай, апрача адной грані. Зроблена на драўляным каркасе ці з лазовых прутоў. Лавілі кломляй удвух. Тапілі прыладу ў вадзе і заганялі туды рыбу.

## НЕКАЛЬКІ СЛОЎ НА РАЗВІТАННЕ

...А што было далей і з якімі думкамі вярнуўся дахаты Максім Мінскі, вы даведаецеся ў іншай казцы. Адно спяшаюся заўважыць: вас ізноўку чакае вандроўка разам з нашым галоўным героем. І не абавязкова — па Беларусі. Хаця, павінен я вам сказаць, падарожнічаць па нашай старонцы, шукаць прыгоды на Міншчыне ці на азёрнай Віцебшчыне, у Слоніме альбо на Берасцейскім Палессі — занятак не меней захапляльны за адкрыццё Амерыкі ці знаёмства з Індыяй.



**Карлюкевіч, А. М.**

К23 Крыніца паноў Ельскіх : казка / Алесь Карлюкевіч ; іл. В. В. Дударэнкі. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2014. — 47 с.

ISBN 978-985-02-1511-6.

Галоўны герой казкі Алеся Карлюкевіча «Крыніца паноў Ельскіх» — вандроўнік яшчэ той: і з паштовымі маркамі выпраўляецца ў вялікую дарогу, і роднымі сцежкамі ходзіць.

І не варта перажываць, што цудоўная кніга хутка заканчваецца. «Крыніца паноў Ельскіх» — пачатак аповесці-казкі пра падарожжы беларускага школьніка і па прасторах роднай краіны, і па ўсім свеце. Як працяг з'явяцца цікавыя кнігі «Як Жаўна лясным жыхарам кватэры будавала» і «Падарожжа паштовай маркі».

**УДК 821.161.1-93**
**ББК 84(Беи)-44**

Літаратурна-мастацкае выданне

**КАРЛЮКЕВІЧ** Алесь
(Карлюкевіч Алесь Мікалаевіч)

КРЫНІЦА ПАНОЎ ЕЛЬСКІХ

*Казка*

Рэдактар *А. В. Спрынчан*
Мастацкі рэдактар *М. В. Пракаповіч*
Тэхнічны рэдактар *Л. С. Зубец*
Стылістычны рэдактар *М. М. Адам*

Падпісана да друку 12.12.2013. Фармат $70 \times 100^1/_{16}$. Папера афсетная.
Гарнітура CentSchbook. Афсетны друк. Ум. друк. арк. 3,9.
Ул.-выд. арк. 2,33. Тыраж 2500 экз. Заказ 2290.

Выдавецкае рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства
«Мастацкая літаратура» Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
ЛИ № 02330/0494049 ад 03.02.2009. Праспект Пераможцаў, 11, 220004, Мінск.
www.mastlit.by; e-mail: mail@mastlit.by

ААТ «Типография «Победа». ЛП № 02330/492 ад 28.01.2013.
Вул. В. Таўлая, 11, 222310, Маладзечна.

ISBN 978-985-02-1511-6
9 789850 215116